ДУК “ПІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА”
АДДЗЕЛ АБСЛУГОЎВАННЯ І ІНФАРМАЦЫІ
СЕКТАР КРАЯЗНАЎСТВА

# *Краязнаўчы каляндар*




**Пінск, 2019**

# *Краязнаўчы каляндар на 2020 год*

## ***<u>У 2020 годзе спаўняецца:</u>***

**440** гадоў з дня нараджэння **ЛЯВОНЦІЯ КАРПОВІЧА** (1580, Пінск – 1620), вялікалітоўскага праваслаўнага рэлігійнага дзеяча, які ўзначальваў антыўніяцкае супрацьстаянне ў ВКЛ, стваральніка і першага архімандрыта Віленскага брацкага праваслаўнага манастыра Святога Духа, пісьменніка-палеміста, кіраўніка брацкай друкарні

**415** гадоў з дня нараджэння **МАКАРЫЯ ПІНСКАГА** (1605–1678), прападобнамучаніка, царкоўнага дзеяча, святога Беларускай Праваслаўнай Царквы

**290** гадоў з дня нараджэння **МІХАЛА КАЗІМІРА АГІНСКАГА** (1730–1800), дзяржаўнага дзеяча Рэчы Паспалітай, кампазітара, паэта, мецэната

**275** гадоў з дня нараджэння **МАЦЕЯ ЯКУБАВІЧА БУТРЫМОВІЧА** (1745, Пінскі пав. – 1814), дзяржаўнага дзеяча Рэчы Паспалітай, падстарасты і мечніка Пінскага павета

**255** гадоў з пачатку будаўніцтва **АГІНСКАГА КАНАЛА**, які злучае рэкі Нёман, Шчару, Ясельду, Прыпяць, даўжынёй 54 км (Пінскі, Івацэвіцкі і Ляхавіцкі р-ны; 1765)

**245** гадоў з пачатку будаўніцтва **ДНЯПРОЎСКА-БУГСКАГА (КАРАЛЕЎСКАГА) КАНАЛА,** які злучае рэкі Піну і Мухавец, даўжынёй 244 км (Брэсцкі, Жабінкаўскі, Кобрынскі, Драгічынскі, Іванаўскі і Пінскі р-ны; 1775)

**230** гадоў з часу пабудавання **ПІНСКАГА ПАЛАЦА М. БУТРЫМОВІЧА**, помніка архітэктуры позняга барока, занесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (Пінск; пач. 1790, верагодна, 1794)

**205** гадоў з дня нараджэння **ФРАНЦА (ФРАНЦІШКА) АНДРЭЕВІЧА САВІЧА** (псеўд. АДАМ ГЕЛЬГЕТ; каля 1815, в. Вяляцічы, Пінскі р-н – 1845), паэта, публіцыста, удзельніка вызваленчага руху, аднаго з пачынальнікаў рэвалюцыйнага дэмакратызму на Беларусі, папярэдніка Кастуся Каліноўскага

**140** гадоў з часу адкрыцця **ЗАТ «ХОЛДЫНГАВАЯ КАМПАНІЯ “ПІНСКДРЭЎ”»,** створанага на базе фанернай фабрыкі акцыянернага таварыства братоў Лур’е (Пінск; 1880)

**135** гадоў з часу заснавання **ААТ «ПІНСКІ ордэна Знак пашаны СУДНАБУДАЎНІЧА-СУДНАРАМОНТНЫ ЗАВОД»,** старэйшага суднабудаўнічага прадпрыемства Беларусі (Пінск; 1885)

**110** гадоў з часу адкрыцця **ЗАВОДА ШКЛЯНЫХ ВЫРАБАЎ «ПІНА»** (Пінск; 1910)

**100** гадоў з часу адкрыцця ў **г.ПІНСКУ МАСЛАЗАВОДА і МЛЫНА** уладальніка А. Кунды (1920)

**100** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ІВАНАВІЧА ЧУКЛАЯ** (1920, Бешанковіцкі р-н, Віцебская вобл. – 1942), удзельніка партызанскага руху **ў Пінскай вобласці** ў Вялікую Айчынную вайну

**85** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ КАЗЛОЎСКАГА**, пінскага мастака.

**80** гадоў з часу заснавання **ААТ «ГІДРАСЕЛЬМАШ»**, прадпрыемства па выпуску сельскагаспадарчай тэхнікі (Пінск; 1940)

**75** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ ДУБРОЎСКАГА** (1945 – 2011), краязнаўца-эколага (г.Пінск).

**75** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ЦМЫГА** (1945 – 2008), пінскага паэта.

**55** гадоў з пачатку будаўніцтва **ААТ «ПРАМЫСЛОВА-ГАНДЛЁВАЕ АБ'ЯДНАННЕ "ПАЛЕССЕ"»,** буйнейшага вытворцы верхніх трыкатажных вырабаў для ўсіх узроставых груп, паўшарсцяной і высокааб'ёмнай пражы трыкатажнага палатна ў Рэспубліцы Беларусь (Пінск; 1965)

**35** гадоў з пачатку стварэння **ААТ «КАВЛІЦМАШ»**, пінскага дзяржаўнага прадпрыемства ў складзе «БЕЛАЗ-ХОЛДЫНГ», вядучага станкабудаўнічага прадпрыемства Беларусі (Пінск; 1985)

**30** гадоў з часу заснавання **УА «ПІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ КАЛЕДЖ МАСТАЦТВАЎ»** (Пінск; 1990)

## *Студзень*

**80** гадоў з часу ўтварэння Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР **РАЁНАЎ У ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БЕЛАРУСІ**, у т. л. у Брэсцкай, Баранавіцкай і Пінскай (1940)

**15** **80** гадоў з часу ўтварэння **БРЭСЦКАГА, БЯРОЗАЎСКАГА, ГАНЦАВІЦКАГА, ДРАГІЧЫНСКАГА, ЖАБІНКАЎСКАГА, ІВАНАЎСКАГА, ІВАЦЭВІЦКАГА, КАМЯНЕЦКАГА, КОБРЫНСКАГА, ЛУНІНЕЦКАГА, ЛЯХАВІЦКАГА, МАЛАРЫЦКАГА, ПІНСКАГА, ПРУЖАНСКАГА, СТОЛІНСКАГА** раёнаў (1940)

2 75 гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСКЕЯ МІКАЛАЕВІЧА ДУБРОЎСКАГА** (1945, Мінская вобл., Барысаўскі раён – 2011, Пінск), эколага, краязнаўца

**16** **60** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА ДЗМІТРЫЕВІЧА ТРАШЧЫЛЫ** (1960, Пінскі р-н), спартсмена (лёгкая атлетыка), трэнера, заслужанага майстра спорту СССР (1988), чэмпіёна свету (1983)

**23** **80** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ ДЗМІТРЫЕВІЧА КУДЗІНЕНКІ** (1940, Расія – 2010), архітэктара, педагога, аўтара шэрага праектаў забудовы мікрараёнаў Брэста, **Пінска**, Кобрына, Драгічына і інш.

## *Люты*

**80** гадоў з часу заснавання **УА «ПІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ КАЛЕДЖ»** (Пінск; 1940)

**2** **85** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА ПАТАПАВІЧА ВАЛЫНЦА** (1935, Пінскі р-н), вучонага ў галіне фізіялогіі і біяхіміі раслін, лаўрэата прэміі акадэмій навук Украіны, Беларусі і Малдовы (1996), прэміі НАН Беларусі (2007)

**12** **125** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА АЛЯКСЕЕВІЧА ТРАЙНІНА** (1895, Пінск – 1956), расійскага ваеннага дзеяча, контр-адмірала, удзельніка савецка-фінляндскай вайны 1939–1940 гг., Вялікай Айчыннай вайны.

**16** **80** гадоў з часу заснавання **ПІНСКАГА КАЛЕДЖА УА «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя А. С. ПУШКІНА»** (1940)

## *Сакавік*

**2** **75** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ВАСІЛЬЕВІЧА ШАПЯЛЕВІЧА** (1945, Пінскі р-н), вучонага-фізіка, доктара фізіка-матэматычных навук, аўтара навуковых даследаванняў па галаграфіі ў фотарэфрактыўных крышталях, лаўрэата прэміі НАН Беларусі імя акадэміка Ф. І. Фёдарава (2011).

## *Красавік*

**75** гадоў з часу адкрыцця **УА «ПІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АГРАРНЫ ТЭХНАЛАГІЧНЫ КАЛЕДЖ»** (Пінск; 1945)

5 **80** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ ІВАНАВІЧА ШПАКОЎСКАГА** (1940, Пінскі р-н – 2001), вучонага ў галіне хірургіі і геранталогіі, члена РАМН

**27** **90** гадоў з дня нараджэння **МАЯ ВОЛЬФАВІЧА ДАНЦЫГА** (1930, Пінск), жывапісца, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1968), заслужанага дзеяча мастацтваў БССР (1973), народнага мастака Беларусі (1995)

## *Май*

**26** **35** гадоў з часу заснавання найбуйнейшай у Еўропе прамысловай плантацыі журавін **«БЕЛАРУСКІЯ ЖУРАВІНЫ»** (Пінскі р-н; 1985)

## *Ліпень*

**1** **90** гадоў з часу адкрыцця **ФАНЕРНАЙ ФАБРЫКІ ТАВАРЫСТВА «ПЛЭЙВУД-ЮНІОН»** у м. Гарадзішча, якая належала польскаму капіталісту Н. Цукеру (Пінскі пав.; 1930)

**23** **330** гадоў з дня нараджэння **ЯКУБА БРЭТЦАРА** (БРЭТЗЕРА; 1690, Пінск – 1733), жывапісца, манументаліста і іканапісца, манаха-езуіта.

## Жнівень

**22 55** гадоў з дня нараджэння **ВОЛЬГІ МІКАЛАЕЎНЫ ШАРАЯ** (1965, Пінскі р-н), вучонага-фалькларыста, этнолага.

**26 65** гадоў з часу заснавання **УА «ПІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНДУСТРЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНЫ КАЛЕДЖ»** (Пінск; 1955)

## Верасень

**27 65** гадоў з дня нараджэння **МАРЫІ ІВАНАЎНЫ ЛЯШУК** 1955, в. Табулкі, Пінскі р-н), пісьменніцы, паэтэсы, лаўрэата прэміі Беларускага союза жанчын, члена союза пісьменнікаў Беларусі, рэдактара

## Кастрычнік

**105** гадоў з часу адкрыцця ў **г. ПІНСКУ ПРЫВАТНАЙ ГІМНАЗІІ А. ЧЭЧЫК** (1915)

**7 255** гадоў з дня нараджэння **МІХАЛА КЛЕАФАСА АГІНСКАГА** (1765, Гузуў, Польшча – 1833), кампазітара-аматара, дыпламата, палітычнага дзеяча Рэчы Паспалітай, удзельніка паўстання Т. Касцюшкі 1794 г., ганаровага члена Віленскага ўніверсітэта

**28 95** гадоў з часу заснавання **ПІНСКАЙ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЕПАРХІІ** (ПІНСКАЙ ДЫЯЦЭЗІІ, ПІНСКАГА БІСКУПСТВА), адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Рымска-каталіцкай Царквы ў Беларусі (Брэсцкая і Гомельская вобл.; 1925)

## Снежань

**17 65** гадоў з дня нараджэння **ЮРЫЯ ЛЯВОНЦЬЕВІЧА**

**САЛАНЕВІЧА** (1955, Пінск), празаіка, паэта.

**24 155** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА САМОЙЛАВІЧА МАРТЫНАВА** (ПІКЕРА; 1865, Пінск – 1935), удзельніка рэвалюцыйнага руху ў Расіі, публіцыста, педагога)

**26 60** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА АДАМАВІЧА ГАЛАЎКО** (1960, Пінскі р-н), вучонага ў галіне аўтаматыкі, кіравання і інфарматыкі.

Складальнік: Баговіч Т.К.,
галоўны біблятэар аддзела абслугоўвання і інфармацыі ЦБ
Снежань, 2019